Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: Вільня, Віленская вул., № 29.

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспацэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей,, хто ня захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія тольні для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. | 18 Верэсьня 1914 г. | № 37

## Два месяцы вайны.

Ўжо два месяцы, як пачалася вялікая Эўропэйская вайна. Небагата гэта часу,--але багата чаго здарылося за гэты час. Перш-на-перш на полі бітвы. Быў момэнт, калі здавалося, што немцы ўжо забяруць сталічнае места Франціі—Парыж. Быў момэнт, калі яны стаялі за 40 вёрст ад Парыжа і маніліся вось-вось увайсьці ў яго, зваеваўшы францускае войска. Але цяпер абраз зьмяніўся: французы, каторым памагае Англія, узмацаваліся, напалі на нямецкую армію і прымусілі яе атступіцца ад Парыжа. Але недалёка зайшлі французы: нямецкае войска дайшло да рэкі Эн, дзе пабудавало ўжо загадзя акопы, пакапало равы і долы, папрацягівало калючые дроты, ды гэтак задзержало паход францускай і злучэнай з ею англіцкай арміі. І вось ўжо дзьве нядзелі б'юцца безупынна бадай увесь час на адным мейсцы: то адны крыху пасунуцца ўпярод, то другіе, каб праз дзень-два вярнуцца на старое мейсцо. Сотні, тысячы і дзесяткі тысяч людзей паляглі ўжо з абодвых бакоў, але бітва не сціхае, ды нет ведама, хто каго тутака зваюе.

Іначэй ідуць справы на вайне, што пачалася між Нямеччынай і Расеей. Сперша расейскае войска шпарка пайшло ўпярод увайшло у граніцы Прусіі ды падступілося пад горад Кэнігсбэрг (Кролевец). Але Расея ваюе не з аднэй толькі Нямеччынай: яна вядзе вайну і з Аўстрыей. А як аўстрыякі пад той час пачалі наступаць на Люблінскую і Холмскую губэрніі (у Польшчы) дык Расея паслала чым больш войска проці Аўстрыі. З гэтаго ўраз жэ скарысталі немцы: яны накінуліся на тое войска, што ўжо пад сцены Кэнігсбэрга падыйшло, і расейская армія прызнала, што лепш адыйсьці к сваей граніцы. Яна і атступілася—глаўным чынам у Сувальскую губэрню да р. Нёмана і тутака спыняе паход немцоў ўпярод. Апошнімі днямі ад стрэлоў расейскаго войска немцам прыйшлося адыйсціся на захад ад Нёмана, і яны апынуліся недалёка ад пруской граніцы: каля Сувалак, Сэйн да Марыамполя. Ня гледзячы на гэта, немцы напалі на крэпасць Осовец, што пабудавана на граніцы Гродзенскай і Ломжынскай губэрній. Пад Осоўцам дагэтуль ідзе вострая бітва.

Расейскаму войску добра пашанцавала у Аўстрыі. Тутака сілы Расеі забралі ўсю усходнюю Галіччыну—дзе жыве украінскі народ, узялі гарады Львоў, Ярослаў і іншые, ды йдуць ужо на найважнейшые у тым боку крэпасьці: Перэмышль і Кракоў.

Немцы ўжо багата войска паслалі на падмогу аўстрыякам. Ад Торуня (крэпасць) і Каліша паказываюцца усё новые і новые нямецкіе корпусы, каб загарадзіць расейцам дарогу у Кракоў: інaчэй, узяўшы Кракоў, расейцам было-бы лёгка ўжо і ў Бэрлін выступіць.

Калі цяпер глянем на ўвесь расейскі фронт, дык убачым, што ён ідзе безмала ад Балційскаго ажно чуць што не да Чорнаго мора. На ўсім фронце йдзе страшэннае змаганьне,—ды йшчэ мо' прыдзецца ваеваць с Турэччынай, каторая папала зусім пад каманду немцоў і хочэ поруч з імі ісьці ваеваць. А ешчэ німа ведама, што зробіць суседка Расеі—Румынія, ды суседка апошняй — Болгарыя. Ад іх шмат будзе залежыць далейшая вайна.

Пакуль людзі ваююць, пакуль тамака далёка нейдзе гінуць людзі ад стрэлоў гарматніх,—на ўсім сьвеці вайна дужа дрэнна адбілася на гандлі і ўсім жыцьці экономічным краёў і народоў. Шмат шкоды робіць яна і Амэрыцы. Вось, прэзыдэнт Злучэных Поўночна-Амэрыканскіх штатоў і пачаў клапаціцца аб замірэньні Эўропы.

Дагэтуль з яго работы карысьці не відаць,—але ў скорасьці мо' што с таго і выйдзе: лішне многа ахвяр людзьмі і багацьцем забірае гэта страшэнная вайна.

———

# ВАЙНА.

### Расейска-Аўстрыяцкая.

Узяўшы крэпасць Ярослаў, расейскае войска наступае далей у глыб Аўстрыяцкай зямлі, забіраючы па дарозе шмат палонных і ўсялякаго аружжа. Найбольшая бітва была у гэты час (каля 9 верэсьня) пры рэцэ Сан, дзе наступаньне нашаго войска непрыяцель хацеў стрымаць узарваўшы мост. На украпленьнях на Сане была устаноўлена цяжкая артылерыя, прожэктары і вялікіе запасы гарматніх набоёў. Ня гледзючы аднак на гэта, расейцы перашлі рэку, заўладалі Ярославам, раней ешчэ быў узяты горад Старое Место. Далей наша войска захапіло Пжэворск і Ланьцут. 11 верэсьня расейцы здабылі узмацаваные пазыціі Чышкі-Фульстын, якіе прыкрывалі Хыроў, і украпленьня ў раёне Радышно. 12 верэсьня выпіхнутае с Хырова аўстрыяцкае войска атступае далей на паўдня, абшырна карыстаючы с чыгунак на Кракоў. Наша войска узяло г. Турка 14 верэсня расейцы занялі Дэмбіцу. На перэвале Карпацкіх гор Ужок, пасьля заўзятых бітваў, наша войска разбіла непрыяцеля, узяло яго артылерыю, шмат палонных і, не пакідаючы пагоні, увайшло на зямлю Вэнгерскую. Крэпасць Перамышль акружэна расейцамі з усіх старон, і ўсе дарогі ад яе пярэрваны Цяперака расейскае войска наступае па трох шляхах: на Кракоў, на Санок і на Ужок; па двух апошніх шляхах кіруецца у глыб Вэнгрыі на Будапэшт. 15 верэсьня у раёне Санока, Ліско занят пасьля таго, як наша войска змусіло уцячы займаўшые гэтые пункты запасные батальёны праціўніка. Дарогі за Санок засеяны кінутым аружжэм, набоямі і павозкамі.

### Расейска-Нямецкая.

На Расейска Нямецкім тэатры вайны пасьля некатораго зацішша пачаліся ужо бітвы. 10 верэсьня расейцы адбілі часць нямецкаго войска, якая мецілася пацісн уцца ў глыб Сувальскай губ. У раёне Шчучына і Вінцэнта адбываліся карысные для нас стычкі пярэдніх атрадоў. 12 верэсьня у раёне Сапоцкіно—Друскенікі пачалася бітва с нямецкім войскам, якая закончылася атступленьнем немцоў. Цяперака немцы абстрэліваюць з гармат нашу крэпасць Осовец. З раніцы 14 верэсьня бітва тут дасьцігла вялікай заўзятасьці. Проба нямецкай пяхоты падайсці бліжэй к крэпасьці не ўдалася. У Аўгустоўскіх лясох расейскае войска з боем паціскаецца наперад. 15 верэсьня. Бітвы з немцамі развівалі ся у раёне Осо вец — Друскенікі — Сімно. Новая проба праціўніка перэбрацца церaз Нёман адбіта. Заўзятая бітва ідзе за паўночные выхады Аўгустоўскіх лясоў. У бітве пад Осоўцом бярэць учасьця нямецкая цяжкая артылерыя.

### Француска-Англіцка-Нямецкая.

Тутака на ўсім фронце каторы ужо дзень ідуць безупынные крывавые бітвы с пераменным шчасьцем для ваюючых старон. Атакі той ці другой стараны адбіваюцца праціўнікам з вялікімі стратамі у людзях і аружжы. Лінія на якой ідуць бітвы, цягнецца болей-меней так: Пэрона—Найон—Рэймс—Мэц--Бэльфор, у аколіцах рэкі Эн. У ночы 13 верэсьня і да 14 верэсьня немцы безупынна кідаліся на ўсім фронце ў заўзятые і крывавые атакі, якіе ім не ўдаліся. Ў Лётарынгіі, Вогезах і Эльзасе палажэньне без перамены.

### Бэльгійска-Нямецкая.

Бэльгійцы прыгатаўляюцца к абароне Антвэрпэну, здабываць які немцы быццам ужо не маняцца. Тырльмон ізноў занялі Бэльгійцы Кругом Бруксэльлі немцы пасьпешна ладзюць украпленьня.

### Японска-Нямецкая.

С 14 верэсьня японцы пачалі. атаковываць першую абаронную лінію Ціндао. Японцы маніліся прыслаць у Эўропу 50,000 свайго войска у помач англічанам. Англічане ад гэтаго атказаліся.

### Сэрбска-Аўстрыяцкая.

10 верэсьня між сэрбамі і аўстрыякамі адбываліся крывавые бітвы на фронтах Эворык—Лозніца—Мітровіца — Шабац. Палажэньне сэрбскаго войска добрае. 14 верэсьня сэрбскае і чэрнагорскае войска наступаючае на Сараево, дасцігла гары Раманіа. Час-ад-часу аўстрыякі усё ешчэ заўзята абстрэліваюць Белград.

### Вайна на моры.

Каля Віндавы 10 і 11 верэсьня паяўляліся нямецкіе ваенные параходы, першы раз 19 штук, а другі— 38. Стрэлялі па нашым маяку, а пасьля атплывалі далей на морэ. Расейцы так сама стрэлялі з берэгу па нямецкім мінаносцу. Каля Далмацінскаго узбярэжжа згінулі ад мін два аўстрыяцкіе мінаносцы. Нямецкіе падводные лодкі затапілі трох англіцкіх ваенных крэйсероў.

### Вайна у паветры.

13 і 14 верэсьня расейцы падстрэлілі два нямецкіе цэппэліны—адзін каля Яблонны, другі каля Цэханова, якіе лётали над Варшавай. Над Мэцам, у франціі, гдзе знаходзіцца глаўная кватэра цара Вільгэльма, лётали францускіе самалёты і кінулі у немцоў болей як сто бомбоў, і знiстожылі чатыры нямецкіе аэропляны. Англіцкімі лятунамі зністожэна ца гэтуль 9 нямецкіх самалётоў. 14 верэсьня раніцай нямецкі самалёт кідаў у вежу Эйфэль, у Парыжы бомбы, не прычыніўшы вялікай шкоды. Над Антвэрпэном так сама лётали нямецкіе самалёты і кідалі бомбы; бэльгійцы стрэлялі у іх з гарматоў.

———

У **Італіі** кажуць цьвёрда, што яна незабавам умешаецца у вайну. Савет італьянскіх міністроў пастанавіў, што ешчэ ненадыйшоў мамэнт пачынаць вайну, але што ўжо час к ёй прыгатаўляцца.

У **Швэйцарыі**. Паведамляюць з Бэрліна, што Нямеччына, Франція, Аўстрыя і Італія угаварыліся між сабой не нарушаць нэйтралітэту (не уцягіваць у вайну) Швэйцарыі.

У **Турэччыне** ваенные прыгатаўленьня не спыняюцца. З дня на дзень чэкаюць абвешчэньня ею вайны Расеі. Расейскі урад заяўляе, што магчымасьць вайны с Турэччынай загадзе была прынята пад увагу, і нашы граніцы добра забаспечэны на выпадак турэцкаго выступленьня. 15 верэсьня туркі закрылі Дарданельскую пратоку для прахода усіх караблёў. Турэцкіе ваенные параходы не перэстаюць выплываць у Чорнае морэ ў розных камбінаціях флота. Да гэтаго часу заўважэна найбольшае зграмаджэньня Турэцкіх змобілізованных войск

мог патрэбуючым німагчыма, бо ўсе засобы вышлі.

**Ураджай.** «Kurjer Lit.» пішэ, што на сколькі ў дварох віленск. губ. сёлетні ураджай жыта удаўся добра, так што могуць ім прахарчавацца круглы год усе жыхары цэлай губэрні, на столькі у селян ураджай дужа дрэнны і хопіць яго толькі да студня або лютаго. Газэта ад сябе дабаўляе, што ужо час каб падумаць аб арган заціі харчэўнай запамогі селян.

**Сеўба жыта** у селян і у дварох Віленск. губ. прайшла удатна. Паміма недастатку рабочых рук с прычыны мобілізаціі, селяне далі сабе раду: усюдах дзе можна было працавалі талакою. Наагул самапомач нашых селян-беларусоў ідзе усюдах складна і прыносіць вялікую карысць самім-жэ селянам. З гэтаго астаецца толькі цешыцца і жадаць, каб і на далей беларусы не забываліся на талаку ў сумеснай рабоце.

**Вайна і вінакуры** У віленск. губ. двары, якіе фабрыкуюць гарэлку і садзюць шмат бульбы на гарэлку, с прычыны аграніченьня прадажы спіртных напіткоў будуць мець страты на бульбе да двух мільёноў рублёў.

**Сібірская пошэсць** (карбункул) у віленск. губ. бадай саўсім ужо вывелася і не чуваць, каб хварэла і гінула ад яе жывёла. Пасьля устаноўленаго каранціннаго сроку, т. е. як саўсім ня будзе страху заносу заразы, аткрыюцца ва ўсіх паветах рынкі

**Нешчасьця** Надовічы у Смаргонях на кажэўнай фабрыцэ (гарбарні) Г. Саладухі лопнуў паравы кацёл. Ад узрыву разрушыліся мураваные сьцены катлоўні і згінуў качагар Машук, малады ешчэ чэлавек і пакінуўшый па сабе сямью.

У сьвенцянскім пав. селянін Альхіновіч з вёскі Укрaпінкі, спусьціўшыся у яму, паткопываў камень. У той час камень неўспадзеўкі абрушыўся і на сьмерць яго заціснуў.

У засьценку Явошыха, ашмянскаго пав. варочаўся с палеваньня Акулевіч, нясучы пры сабе стрэльбу, і так нешчасьліва паваліўся, што стрэльба выстрэліла і ўвесь набой папаў яму у жывот. Акулевіч сяк-так дапоўз дамоў і тут-жэ сканаў. Гэта дужэ важная асьцярога для ўсіх паляўнічых.

**Пажары.** У дварэ Лебедзево, вілейск. пав., с прычыны нявычышчанаго коміну згарэў дом п. Б. Цывінскаго, што варт быў 6,000 руб. З домам згарэла хатняе дабро на 2,000 р. У Лідзе пажар знішчожыў два дамы Тубілевіча і адзін Г. Брэма. Шкоды каля 20,000 р.

## З Міншчыны.

**Аб пісьмах.** У Мінску выйшоў ад ваеннай уласьці такі загад: „С прычыны труднасьці, якая выходзе пры цэнзуры карэспандэнціі на вэнгерскай і жыдоўскай мовах, прадпісываю лічыць такую неналежачай к перасылцэ у мейсцы назначэньня. Пісьмы, напісаные у азначэных мовах, належаць к зністожэньню пры цэнзуры. Пісьмы ваенна-палонных дазваляць толькі аткрытые у расейскай, францускай, славянскай і нямецкай мовах. Пісьмы гэтые абавязкова прэдстаўляць для прачытаньня мейсцоваму ваеннаму цэнзару або ў ваенна-цэнзурную камісію пры штабе давераннаго мне вокругу».

**Для семьяў запасных.** Шмат дзе у ігуменск. пав. сельскіе сходы прыгаварылі адлічаць грошы з мірскіх павіннасьцяў на уборку і абсеву поля семьяў запасных.

**Новая гімназія.** Аткрылася недаўна у Несьвіжы гімназія для дзеўчат, на якую злажыліся слуцкае земство, несьвіжскае гарадзкое упраўленьне і запамогі прыватных асоб.

**Заместа манапольскі школа.** Селяне гаспадары вёсак Вялікіх і Малых Труханавічэў, пукоўск. вол., слуцк. пав., хлапочуць аб закрыцьці манапольскі і аб аткрыцьці заместа яе другой народнай школы.

**3,000 р. за піва.** У Мінску гаспадар піўной І. Карнакоў за патайную прадажу спіртных напіткоў аштрафованы на 3,000 р. або тры месяцы пад арышт.

**За жонку запасногa.** Мешчане м—ка Глуска, бабруйск. павету, Ганна і Якуб Шклярэвічы аштрафованы на 1000 р. або паўтары месяцы арышту кожны за тое, што самаўпраўна выселілі жонку запасного.

**Дзесяць год катаргі за гарэлку.** У Мазыры акружны суд засудзіў на дзесяць год катаргі селяніна Т. Сыса. Было так: Пьяны Сыс прыстаў да свайго суседа Ф. Пеўца, каб той даў яму гарэлкі. Калі Певец атказаўся, то Сыс нажом зраніў яго на сьмерць, параніў яго жонку і высек вока селяніну Лемезу.

**Пажар.** У вёсцы Гудобоўка, Барысоўс. пав. выгарэло 51 селянскіх сяліб. Шкоды каля 60,000 р.

## З усіх старон.

**Ваеннае палажэньне.** Найвышэйшым Указам абвешчаны на ваенным палажэньні чыгункі: Сібірская, у раёне між станціямі Боготоль і Інокенцьеўская, Забайкальская і Кітайская усходняя з яе Уссурыйскім аддзяленьнем.

**Замена спіскамі ваенна-палонных.** Паміж ваюючымі дзержавамі—Аўстрыей і Нямеччынай з аднэй стараны і расейскім, францускім, англіцкім і сэрбскім урадамі з другой стараны—завязалася умова аб замене спіскамі ваенна-палонных.

**Для раненых.** У трох гарадох вітэбскай губ. устроены лазарэты на 12,300 ложак: у Вітэбску—на 2,300, у Полацку—3,000 і ў Двінску—7,000 ложак. У Сумах і Разані зачынілі казённые вінные склады, а памяшчэньня складоў аддалі пад лазарэты. У Пскове так сама казённые склады гарэлкі ва ўсей губэрніі пастаноўлена прыладзіць пад лазарэты. Некольki пскоўскіх школ замянілі на лазарэты для раненых.

**Аб пісьмах у Галіччыну.** Пачтовае упраўленьне у Львове паведамляе, што пакуль наладзіцца акуратны дарожны рух паміж Галіччынай і Расеей, пісьмы, пісаные у Галічыну, будуць перэсылацца толькі тые, што заадрэсованы у дзействуючую армію. Пісьмоў, адрэсованых прыватным асобам, пачтовае упраўленьне прыймаць ня будзе.

**Аб „манапольках“.** Акцызнае ведамство загадало закрываць манаполі, што стаяць каля вялікіх дарог і гасьцінцоў і маюць значэньне даўнейшых корчэм. Побач з гэтым усіліваецца дагляд і за прыватнымі шынкоўнямі, якіе так сама будуць закрывацца як сконьчыцца срок на патэнт.

Як пішэ «Вечэрняя Газэта», ёсьць праект перакуліць палавіну манаполек у зберэгацельные касы. Цаперака ёсьць 26,000 казённых манаполек і 8,500 зберэгацельных кас. Магчыма, што часьць „казёнак“ будзе заменена ў пачтова-тэлеграфные канторы.

**Вайна с пьянствам не спыняецца.** Гэтак, у Барнауле і Вольску гарадзкіе думы пастанавілі старацца аб закрыцьці у іх гарадох на заўсёды усіх манаполек і шынкоў. У Калужскай губ. селяне робюць прыгаворы аб закрыцьці у цэлых валасьцях на заўсёды усіх шынкоўнёў. Варопольскі валасны сход, як адзін чэлавек, прыгаварыў старацца аб закрыцьці усіх шынкоўнёў ва ўсей воласьці на заўсёды. Аб тым самым стараецца і зарайское (Разанск. губ.) паветовае земство.

**Акцыз на соль і вату.** Урад маніцца завясьці акцыз на соль, або зрабіць казённую продаж (манаполію) яе, што дасьць казне даходу каля 20—25 мільёноў руб. Так сама пастаноўлена с прычыны ваеннаго часу аблажыць падаткам вату на 1 р. 50 к. ад пуда, і павышыць пошліну на 1 р. ад пуда за прывожэную вату з-за граніцы.

**Золата даражэе.** Адгукнулася вайна і на цэне золата. Да вайны залатнік (96-я часьць фунта) чырвонаго золата цаніўся каля 5 р. 55 к., а пасьля абвешчэньня вайны цэна на яго патскочыла да 7 руб. за залатнік. Цяперака-ж каштуе 6 р. 30 к.

**Зьменьшэньне грашоўной едзініцы.** У звязку з вайной, гутараць у урадзе аб паніжэньні грашоўной едзініцы з аднаго рубля да 45—50 кап.

**Усерасейскі зьезд** хаўрусу гарадоў у Маскве наклікае злучацца у агульназемскую або іншые арганізаціі для нясененьня помачы раненым.

**Прафэсар Бодуэн дэ-Куртнэ,** засуджэны за свае кнігі на год крэпасьці, будзе, як паведэмляюць з міністэрства судоўніцтва, паміланы.

**Штраф.** Па загаду Глаўнакамандуючаго арміей аштрафавана на 10,000 р. рэдактара петроградзкай газэты «День» за тое, што ён не даў у цэнзуру надрукаванай у № 244 стацьці пад загалоўкам „Замѣтки“.

**Акціі нямецкаго цара.** Пераканаўшыся, што намецкі цар Вільгэльм II мае акціі аднаго з горнапрамысловых заводоў у Расеі, урад сканфіскаваў гэтые акціі на колькі мільёноў рублёў.

**Знішчажэньне двара (маёнтку) Вялікаго Князя.** У расейскіх газэтах пішуць, што немцы саўсім знішчожылі двор Вялікаго Князя Міхаіла Александровіча „Загор'е“, распаложэны непадалёк ад Чэнстаховы.

**Сестра на брата...** У Харкаве 14-летняя гімназістка Ціханова у спрэчцэ забіла са стрэльбы свайго брата інжынера. Пад уражэньнем убіўства Ціханова звар'явалася.

**Пажар.** У Ліпску (у Нямеччыне) згарэла выстаўка графічнаго (рысавальнаго) штукарства. Павільёны Расеі, Франціі і Англіі выгарэлі саўсім. Агонь знішчожыў багатые калекціі, выстаўленые гэтымі краямі.

## Аб усім па троху.

**Марскіе сілы ваюючых дзержаваў.**

**Англія** маець 975 уваружэнных ваенных параходоў, на іх—4,024 гарматоў і 150,000 войска.

**Францыя**—428 параходоў с 3,819 гарматамі і 50,900 войска.

**Нямеччына**—382 параходы, на іх 2,541 гармат і 57,660 людзей.

**Аўстрыя**—204 ваенные параходы, 1,577 гарматоў і 17,000 войска марскога.

Такім парадкам марскіе сілы Англіі і Франціі лічуць 1 403 ваенных параходоў, 7,843 гарматы і больш за 200,00 морскаго войска, а Нямеччына і Аўстрыя маюць усяго 586 параходоў, 4,118 гарматоў і 74,360 войска. З гэтых лічбоў можна бачыць на сколькі Англія с Франціей дужэйшые на моры ад Нямеччыны і Аўстрыі.

**Колькі каштуе граната.**

За гранату для броненосца адна ангельская фірма бярэ ад 400 да 800 р. Адна амэрыканская фірма бярэ за гранату ад 600 да 1.200 рубл. Але гэтые цэны пастаўлены за гранаты не набітые. Гранаты-ж з гатовым набоем каштуюць шмат даражэй.

**Ваенные расходы ваюючых дзержаваў.**

Расходы на армію і флот вялікіх ваюючых дзержаваў так аблічаюць на маркі па бюджэту на 1914 г. Марка—каля 50 кап.

| | Ўсяго ў тысячах. | На кожн. душу. |
|---|---|---|
| Расея | 1.834.991 | 11,47 |
| Францыя | 1.203.535 | 32,39 |
| Англія | 1.640.874 | 35,36 |
| Японія | 395.866 | 7,20 |
| Нямеччына | 2.245.633 | 32,83 |
| Аўстро-Вэнгрыя | 726.637 | 13,25 |

## Пачтовая скрынка.

**Алесю Гаруну у Якуцку.** Вершык Ваш атрымалі, друкуем. Прысылайце болей на гэтые тэмы.

**Міхалку Галку.** „Чортава зельле“ атрымалі толькі што, і ўжо друкуецца.

**Галубку у Мінску.** Напішыце штонебудзь з гутарак з раненымі беларусамі; такая тэма для газэты дужэ на часе.

**М. Рэйману у в. Слауковічы.** Прысланые вершыкі не надаюцца: напісаны не па беларуску. Есць у расейскаго паэты Лермонтова верш, які пачынаецца: „І скучно, і грустно“... такі-ж самы пачатак і аднаго Вашаго вершу: „І скучна і нудна“... Трэба шчырэй звертаць увагу на сваё роднае і больш углубляцца у беларускую народную паэзію і мову, дык ня трэба будзе тады пажычаць нам думак і слоў у чужых.

Рэдактар-Выдавец

**І. Луцэвіч.**

**Прыймаецца далей падпіска на „Нашу Ніву“ на 1914 г.**

Цэна на год—2 р. 50 кап., на 6 мес.—1 р. 25 к., на 3 мес.—65 к., на 1 мес.—25 кап.

*Адрэс: Вільня, Віленская 29.*

Друкуецца і скора выйдзе

**„БЕЛАРУСКІ КАЛЕНДАР“**

**на 1915 год.**

Календар друкуецца двумя асобнымі выданьнямі: рускімі і лацінскімі літэрамі, з іншым у кожным тэкстам.

Заказы на календар трэба прысылаць загадзе у „Беларускую Кнігарню“, Вільня, Завальная № 7.

**Прыймаюцца ў календар на сходных варунках абвесткі.**

Друкарня Марціна Кухты, Татарская 20.